© PDF: Kamunikat.org 2013 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013




**TV**

СПАДАРОЖНІКАВАЕ!
● БТ, РТР, Астанкіна, НТБ С.-Пецярбург, Польшча-1, Польшча-2.

## КАНФУЗ

### у медінстытуце...

*Пад час прыёмных экзаменаў у Гарадзенскім медінстытуце працавала ня толькі прыёмная камісія, але таксама грамадзкая —Службы кантроля Адміністрацыі Прэзідэнта на Гарадзенскай вобласьці. Ішоў экзамен па хіміі, усе працы абітурыентаў былі зашыфраваныя...*

ст. 3




## КРЫМІНАЛ

*Ліквідацыя калгасаў у Летуве, пераход да сялянскіх гаспадарак выклікалі вострую патрэбу ў конях...*

*Матэрыялы на крымінальную тэму чытайце на* ст. 8.






У выхадныя дні чакаецца пераменная хмарнасьць. Вецер усходні, 4-9 м/сек. Уначы без ападкаў. Днём 28 і 29 верасьня магчымы кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра 28-га ноччу 2-7 градусаў цяпла, месцамі прымаразкі да -2 градусаў. Удзень +9-14. 29-га ноччу 3-8, днём - 7-12 градусаў вышэй нуля.


# ПАГОНЯ

ЗАСНАВАНА У 1920 г

ВЫХОДЗІЦЬ ПА ПЯТНІЦАХ

ГРАМАДЗКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

№ 39 (186) • 27 верасьня — 3 кастрычніка 1996 г. • Кошт свабодны


## АЛЯКСАНДР РЫГОРАВІЧ «РАСКРЫЎ» ЧАРГОВУЮ ЗМОВУ

**!!! СКАНДАЛ**

**Лукашэнка абвінаваціў паслоў краін НАТА, акрэдытаваных у Менску ў арганізацыі змовы супраць яго асобы.**

Пад час выступу на сустрэчы з прадстаўнікамі арганізацый моладзі, Лукашэнка паведаміў, што 11 верасьня у Менску адбылася сустрэча сямі або васьмі паслоў краін НАТА.

Па яго словах, гаворка на сустрэчы ішла аб тым, каб прынізіць беларускага прэзідэнта і падтрымаць асобных дэпутатаў Вярхоўнага Савету.

План паслоў, у перakaзе прэзідэнта, складаўся з наступных пунктаў: не сустракацца да рэферэндуму з Лукашэнкам, каб не павышаць яго аўтарытэт, накіраваць ў Менск амерыканскую камісію для таго, каб скласьці даклад кангрэсу аб парушэньнях правоў чалавека ў краіне, правесьці ў сталіцы Беларусі шэраг антыпрэзідэнскіх канферэнцый. Да ліку апошніх Аляксандр Лукашэнка аднёс адбыўшыся ў Менску кангрэс, які быў арганізаваны ПЭН-цэнтрамі Беларусі, Расеі і Швецыі.

Яшчэ адзін пункт вераломнага плану паслоў - запрасіць некалькіх журналістаў у ЗША і Вялікабрытанію.

«Это что, порядочно, орудовать на территории Белорусии и указывать, как нам жить! - ускрыкнуў прэзідэнт. - Мы сами будем решать судьбу нашего народа».

Закранаючы пытаньне міжнароднай сітуацыі, Аляксандар Лукашэнка сказаў: «Из-за своей парядочной позиции я попал между молотом и наковальней, наковальня - это Запад, молот - определенные силы в России».

У 1994 годзе кандыдат у прэзідэнты Беларусі, Аляксандар Лукашэнка заявіў, што адзін з яго куміраў - Фелікс Дзяржынскі. Не даюць спаць лаўры Фелікса Эдмундавіча, надта хочацца змову раскрыць.

**М.Дымаў.**

**Калі вярстаўся нумар:** *Амбасада ЗША у Менску назвала абуральным сьцьвярджэньне прэзідэнта Лукашэнкі аб тым, што паслы краін НАТА плануюць супраць яго змову. У заяве амбасады гаворыцца, што Вашынгтон патрабуе афіцыйнага тлумачэньня ад МЗС Беларусі.*

*Таксама рэзка адрэагаваў на абвінавачваньне прэзідэнта Беларусі Дзяржпэпартамант ЗША. Прадстаўнікоў ураду ЗША турбуе палітыка ў пытаньнях правоў чалавека, якую праводзіць урад Лукашэнкі.*

## БЫЛІ! ЁСЬЦЬ! БУДЗЕМ!

Адразу пасьля паведамленьня пра тое, што Дзяржкамдрук па ініцыятыве ветэранаў НКУС-МДБ-КДБ зьвярнуўся ў суд дзеля «прекращения деятельности» «ПАГОНІ», у рэдакцыі літаральна не астываюць тэлефоны. Людзі выказваюць словы падтрымкі, пытаюцца, чым дапамагчы. Мы атрымалі дзесяткі лістоў, дзе выказваецца абурэньне беспадстаўнымі абвінавачваньнямі ў адрас «ПАГОНІ».

Вялікі дзякуй тым, хто ў гэты цяжкі для нас усіх час прынцыпова вызначыў сваю пазіцыю, дапамог нам маральна і матэрыяльна, прапанаваў свае паслугі. Хочам таксама запэўніць сваіх чытачоў і прыхільнікаў, што «ПАГОНЯ» выстаіць і пераможа. Што б ні здарылася, мы абавязкова знойдзем дарогу да свайго чытача.

Патугі тых, хто стаў на дарозе беларускага Адраджэньня, вольнага слова, - марныя. Раней ці пазьней магутная Беларуская Паводка змые гэты бруд з нашай зямлі. Бо,

*Мы, як зубры,*
*Мы ў сябе дома,*
*Тутэйшыя, што ад вякоў жывуць.*
*Мы, як дубы,*
*Нас можна зьнішчыць громам,*
*Але з зямлі нас роднай*
*Не скрануць...*

**Мікола МАРКЕВІЧ.**

## КВОТУ НА «СХОД АЎТАРЫТЭТАЎ» АД УНІВЕРСІТЭТУ АТРЫМАЎ ЯГО РЭКТАР

**На гэтым тыдні на Гарадзеншчыне абраны ўсе 650 чалавек, якія будуць прадстаўляць нас на Усебеларускім сходзе. Горадню будуць рэпрэзентаваць 157 удзельнікаў.**

20 верасьня свайго адзінага прадстаўніка абіраў Гарадзенскі універсітэт. На канферэнцыі працоўнага калектыва ўніверсітэту выступіў намесьнік старшыні гарвыканкаму Я.Жабрун. На пытаньні прадстаўнікоў калектыву аб юрыдычных поўнамоцтвах сходу спадар Жабрун адказаў, што пра гэта ў прэзідэнцкім указе нічога не гаворыцца, а пра тое, ці адбудзецца рэферэндум і калі, сказаў, што ня хоча лезьці ў палітыку, чым выклікаў ажыўленьне ў прысутных.

Потым было паднятае пытаньне, як можна выбіраць дэлегата на сход, дзе людзі з невядома якімі паўнамоцтвамі будуць вырашаць невядома што. З гэтай нагоды дэкан гуманітарнага факультэту І.Веленга зазначыў, што дэлегат ад універсітэту ўсё роўна павінен быць, а чым яго «узброіць», залежыць ад таго, якія наказы ён атрымае.

Праблема рэферэндуму, яшчэ такая актуальная за дзень да таго, калі на факультэтах зьбіралі сходы, каб атрымаць прапановы па новай Канстытуцыі, неяк сама сабой гасілася прэзідыумам. Пра Канстытуцыю нават не ўзгадалі, а на пытаньне , якая ўсё ж пазіцыя калектыву ўніверсітэту па прэзідэнцкіх і парламенцкіх пытаньнях на рэферэндуме, шчыра адказалі, што пакуль ніякай.

У рэшце рэшт, без альтэрнатывы быў абраны рэктар універсітэту Л.Ківач. Некаторыя яго віншавалі і пляскалі ў далоні. З чым віншавалі, ведаюць толькі яны самі.

**Сяргей САМАСЕЙ.**

## СЫРНАЕ СПАБОРНІЦТВА

У Дзятлаве прайшоў абласны агляд-конкурс вытворцаў сыру. Удзел прынялі прадпрыемствы з Горадні, Навагрудку, Слоніму, Смаргоні, Ашмян, Шчучыну, Скідаля і прыватныя гаспадары. Лепшым на Гарадзеншчыне прызнаны сыр «Букавінскі» з Дзятлава.

**Вацлаў СЯРПІНСКІ.**

## БУДЗЕМ РАЗЬЛІЧВАЦЦА З ПАЛЯКАМІ «ЗАЙЧЫКАМІ»

**Пад час сустрэчы прэм'ер-міністраў Польшчы і Беларусі 21-га верасьня былі абмеркаваны пытаньні працы памежных пераходаў і ўзаемаразьлікаў паміж суб'ектамі гаспадараньня абедзьвюх краін.**

Адной з галоўных праблем двухбаковых адносін польскі прэм'ер назваў праблему пераезду аўтатранспартам беларуска-польскай мяжы. Праз два месяцы павінна скончыцца рэканструкцыя пераходу Баброўнікі. Польскі бок пачынае будаўніцтва тэрміналу ў Карашчыне, у якім можна будзе разьмясьціць 500 грузавых аўтамабіляў.

Таксама прэм'еры абмеркавалі магчымасьць увядзеньня разьлікаў паміж суб'ектамі гаспадараньня Польшчы і Беларусі ў нацыянальных валютах абедзьвюх краін.

**Ул.інф.**

## РЫНАК-БАРОМЕТР

Два тыдні з-за недахопу сыравіны ў Лідзкіх крамах былі перабоі з мясам і каўбасой. Варанай каўбасы не было зусім. У выніку на гарадзкім кірмашы кілаграм сьвініны сягнуў пад 70 тысяч рублёў.

**Яраслаў ГРЫНЬКЕВІЧ.**

## ЗА ПАРУШЭНЬНЕ ЗАКОНА ПРЫДЗЕЦЦА АДКАЗВАЦЬ

**19-га верасьня Гарадзенскі аблвыканкам зьвярнуўся да жыхароў прынёманскага краю з заклікам падтрымаць ініцыятыву прэзідэнта па правядзеньні рэферэндуму 7 лістапада.**

У сувязі з гэтым «Каардынацыйны камітэт партыйных арганізацый і грамадзкіх аб'яднаньняў Гарадзенскай вобласьці ў абарону канстытуцыйнага ладу, законнасьці і дэмакратыі» распаўсюдзіў заяву, у якой, у прыватнасьці, гаворыцца:

«1. Згодна з дзеючай Канстытуцыяй толькі Вярхоўны Савет прызначае дату правядзеньня рэферэндуму. Рашэньнем ВС рэферэндум прызначаны на 24 лістапада. Таму правядзеньне рэферэндуму ў любы іншы тэрмін (у тым ліку 7 лістапада) зьяўляецца НЕЗАКОННЫМ. Заклік да яго падтрымкі -гэта заклік да незаконных дзеяньняў.

2. Згодна з арт.18,20,23 «Закона аб народным галасаваньні (рэферэндуме)» камісіі па правядзеньні рэферэндуму ўсіх узроўняў фармуюцца адпаведнымі Саветамі дэпутатаў. Фармаваньне камісій прэзідэнцкай вертыкальлю зьяўляецца НЕЗАКОННЫМ...»

Гарадзенскія палітыкі нагадваюць «служачым выканкаму і ўсім службовым асобам, якія маюць дачыненьне да арганізацыі і правядзеньня рэферэндуму, аб непазьбежнай судовай адказнасьці за парушэньні Законаў і Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь».

Удзельнікі каардынацыйнага камітэту зьвяртаюцца да жыхароў Гарадзеншчыны з заклікам «ня ўдзельнічаць у незаконнай акцыі, якая арганізуецца выканаўчай уладай».

**Ул.інф.**



*ЗЯНОН ПАЗЬНЯК:*

## ВЫНІКАМ НАШАГА ЗМАГАНЬНЯ СТАНЕ ПЕРАМОГА

**Ліст да сяброў Беларускага Народнага Фронту.**

Паважаныя сябры Фронту! Шкада, што я не магу прыехаць і сустрэцца з вамі, як гэта рабіў раней. Але тыя, якія акупавалі нашу краіну і захапілі не належную ім уладу, тыя, хто планавалі пазбавіць мяне свабоды і жыцьця, пралічыліся. Мы, як арганізацыя і рух, ня страцілі сваіх пазіцыяў, а, наадварот, набылі новыя і пастараемся выкарыстаць іх дзеля свабоды, незалежнасьці і дабра Беларусі.

Зараз лукашэнкаўская агітацыя за рэферэндум узьведзена ў ранг дзяржаўнай палітыкі: ідзе шалёная прапаганда і дэзінфармацыя насельніцтва з боку хунты, розных агентурных арганізацыяў і асобаў. Людзі амаль ня чуюць альтэрнатыўнай здаровай думкі. Наша задача цяпер усімі спосабамі давесьці людзям сапраўдную інфармацыю пра дзеяньні хунты, пра рэферэндум, пра палітыку Масквы, пра пазіцыю Народнага Фронту.

Людзям, ашуканым прапагандай, трэба тлумачыць. На рэферэндум цынічна выстаўлена пытаньне аб наданьні Лукашэнку аднаасобнай абсалютнай ўлады і неабмежаваных паўнамоцтваў. Гэтыя паўнамоцтвы, запісаныя ў папраўках да Канстытуцыі, якая прапанаваная на рэферэндум. Усе астатнія пытаньні малаістотныя і ўнесеныя толькі, каб сьцягнуць патрэбны хунце электарат на галасаваньне. (але ігнараваць іх ня трэба). Такім чынам галасаваць будуць «за Канстытуцыю», а прагаласуюць за дыктатуру, за рэпрэсіі, за дыскрымінацыю беларусаў,

Пасьля таго, як хунта выйграе рэферэндум, ніякія выбары ня будуць ужо мець значэньня. Бо ўступіць у дзеяньне Лукашэнкаўская канстытуцыя, якая, паўтараю, дае Лукашэнку ў рукі абсалютную ўладу і свабоду любых дзеяньняў. Вярхоўны Савет будзе ліквідаваны прэзідэнтам ( прытым ужо «законна»), а выбары акажуцца непатрэбнымі. Увогуле, усе злачынствы і рэпрэсіі хунты пасьля рэферэндуму будуць узаконены «мандатам народу». Вось чаму ўсю працу здаровых грамадзка-палітычных сілаў Беларусі трэба скіраваць на правал авантурнага рэферэндуму. Не распыляць іх на ўдзел у выбарах, на выбарчую кампанію і ўсялякую неістотную і непатрэбную ў дадзеным выпадку работу, а сканцэнтравацца на галоўным, памятаючы, што ўсе рэферэндумы, якія праводзіць аўтарытарная ўлада ў сваіх інтарэсах, яна як правіла выйграе. Рэферэндумы ў недэмакратычным грамадзтве — гэта зброя дыктатуры.

Пасьля рэферэндуму становішча кардынальна зьменіцца. Альбо ў выніку перамогі хунты ўстанаўліваецца абсалютная дыктатура Лукашэнкі, альбо ў выніку правалу рэферэндуму правальваецца і Лукашэнка. Некаторыя людзі ( нават у Фронце), што жывуць у палітыцы сваімі жаданьнямі і пачуцьцямі, думаюць, што ўсяроўна трэба ўдзельнічаць у выбарах, бо спадзяюцца іх выйграць. Жаданьне такое вялікае, што яны ня хочуць зразумець - пасьля рэферэндуму іхная «перамога» будзе зьліквідавана. Яны нагадваюць тых пасажыраў на тонучай лодцы, што ў час буры ўхапіліся за свае чамаданчыкі з дабром, не жадаючы выкінуць іх за борт, каб аблегчыць баласт. Так і пайшлі на дно з чамаданамі. Трэба рабіць рэальныя высновы з нашых памылак у траўні 1995 г., калі асноўныя сілы Фронту былі кінуты на выбары, а не на рэферэндум, Вынікі рэферэндуму прынесьлі незьлічоную шкоду Беларусі. Праўда, тады сітуацыя не была такой простай, як цяпер, і ня ўсё можна было прадбачыць. Цяпер жа становішча выразна зразумелае. Мэты хунты адкрытыя. Верасьнёўскі Сойм БНФ на аснове аналізу і дыскусіі прыняў правільнае палітычнае рашэньне - усе сілы на барацьбу супраць ашуканцкага рэферэндуму. Тэба выкарыстоўваць метады выпрабаваныя і метады новыя. Трэба адразу пачынаць працаваць, не губляць ні хвіліны.

Цяпер ужо нельга блытаць людзей бескарыснымі выбарамі і выбарай агітацыяй, адцягваць іхную ўвагу ад галоўнага. Ня трэба прымушаць думаць народ пра валасы, калі ён можа страціць галаву. Гэта было ўсё ўлічана на Сойме і гэта правільна. Практыка паказала, што калі зьявяцца кандыдаты ў дэпутаты, то ўся агітацыя будзе за іх, а не супраць рэферэндуму. Рашэньні Сойму трэба хутка і эфектыўна выконваць. Зьвяртаю ўвагу сяброў Фронту, што на адказных этапах гісторыі Беларусі і палітыкі БНФ заўсёды ўзмацнялася антыфронтаўская прапаганда і работа, уздымалася хваля інсінуацыяў, пытаньняў, дэзінфарматарскіх меркаваньняў, ярлыкоў і проста плётак, актывізоўвалася ўнутрыфронтаўская агентура рэжыму, пачыналі іграць амбіцыі, зьяўляліся прапановы пра падзелы, чуткі пра расколы і г.д. Усё гэта мы з вамі ўжо перажывалі. Таму адносіны да такіх зьяваў ( што пацьвярджае і наш вопыт) павінны быць стасаваныя, зыходзячы з палітычнага характару арганізацыі. Гэта значыць ужываць статутныя санкцыі ( што мы раней вымушаны былі рабіць і не памыліліся). Людзям, якія з Фронтам толькі таму, што ім хочацца ў што б там ні стала, нават супраць логікі і палітычных рашэньняў арганізацыі, стаць дэпутатамі, наўрад ці ёсьць што ў Фронце рабіць. Усе ранейшыя выпадкі ( а іх было шмат), калі ў выніку кампрамісаў такія кандыдаты станавіліся дэпутатамі ад Фронту ( ці пры нашай дапамозе ), нічога добрага і ніякага станоўчага працягу не далі. Усе прыклады былі адмоўнымі. З такімі асобамі трэба разьвітвацца без шкадаваньня, інакш нашы арганізацыі будуць тапіцца ў балоце канфліктаў, бытавой і амбі-цыйнай сьвядомасьці. Тым больш цяпер, калі на карту пастаўлены лёс дзяржавы і нацыі.

Кіраўніцтва арганізацыяў павінна ўзяць на сябе клопат растлума-чэньня рашэньняў Сойму і палітычнай пазіцыі Фронту тым сябрам Фронту, хто не валодае інфармацыяй і ня ўсё разумее. Мы павінны памятаць аб палітычным адзінстве нашага руху і аб адказнасьці перад Радзімай, якая ў гэты цяжкі час на ўсіх нас ляжыць. Фронт ніколі не павінен губляць палітычную ініцыятыву.

Павінен сказаць, што з вялікім жалем гляджу на нерашучую дзейнасьць Вярхоўнага Савету. Апошні раз я зьвярнуўся да дэпутатаў парламанту 11 верасьня ( газэты не надрукавалі мой зварот). Размова ішла пра імпічмент, які дэпутаты за лета так і не падрыхтавалі. Аб'яўленьнем імпічменту вырашаецца практычна ўсё. Цяпер жа часу амаль не засталося. Ужо ў бліжэйшы час хунта паспрабуе, відаць, альбо блакаваць працу парламанту, альбо зьмяніць яго кіраўніцтва. Палітыка - гэта, перш за ўсё, ініцыятыва. Вярхоўны Савет не разумее нават гэтага. Шкада.

Структуры БНФ павінны быць гатовымі да любога разьвіцьця падзеяў. Нішто ня можа застаць нас зьнянацку. Мы павінны быць гатовымі змагацца ў любых умовах. Канчатковым вынікам нашага змаганьня стане перамога.

**15.09.1996 г. Нью-Ёрк.**

© PDF: Kamunikat.org 2013 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013



# ПАЛІТЫЧНАЯ СЦЭНА

**Спадару Старшыні Вярхоўнага Савету Рэспублікі Беларусь Сямёну Георгіевічу Шарэцкаму**

## ЗВАРОТ да дэпутатаў парламанту

Спадары дэпутаты! Падтрымліваю і вітаю вашыя станоўчыя ініцыятывы па захаваньні законнасьці і абароне парламентарызму ў Рэспубліцы Беларусь. Але ў гэты пагрозьлівы для грамадзтва час адчуваю абавязак зьвярнуцца да вас як грамадзянін Беларусі, як былы дэпутат Вярхоўнага Савету, як старшыня Народнага Фронту. Над Беларусьсю навісла пагроза жорсткай, нічым не абмежаванай, абсалютнай дыктатуры неўраўнаважанай асобы аднаго чалавека. Лукашэнка ставіць мэту шляхам рэфэрэндуму легітымізаваць захоп'улады, узаконіць дыктатуру і рэпрэсіі супраць іншадумцаў, зьняць з сябе адказнасьць за разбурэньне беларускай дзяржавы, культуры, эканомікі. Сітуацыя, падобная, як у Нямеччыне 1934 г., калі Гітлер праводзіў рэферэндум аб наданьні яму абсалютнай улады - і атрымаў яе. Ва ўмовах прэзідэнцкай манаполіі на радыё, тэлебачаньне і друк, ва ўмовах беззаконьня і ўзурпацыі ўлады, ва ўмовах, калі прэзідэнт бескантрольна распараджаецца бюджэтам дзяржавы, любы рэферэндум, які праводзіць узурпатар, будзе выйграны ўзурпатарам.

Калі рэферэндум адбываецца - рэжым перамагае. Ніякія выбары і давыбары ня будуць тады ўжо мець значэньня (ня трэба ў іх і ўдзельнічаць) бо зьменіцца Канстытуцыя. Вярхоўны Савет пасьля рэферэндуму будзе ліквідаваны законна на падставе нібыта волевыяўленьня народу законным і абсалютным дыктатарам. Рэпрэсіі будуць таксама законныя, асьвечаныя «воляй народу», беззаконьне і крымінальшчына ўлады стануць законнымі дзеяньнямі авантурыстаў, якія будуць размахваць народным мандатам на народнае зьнішчэньне.




У гэтым становішчы адзінае, што можа прадухіліць дыктатуру - гэта імпічмент / адхіленьне ад улады / прэзідэнта Лукашэнкі. Калі пастанова аб імпічменце тэрмінова ня будзе прынята, Вярхоўны Савет XIII скліканьня гэтым самым падпіша прыгавор сабе і прыгавор нацыі. У краіне не застанецца тады ніякай улады і ніякай сілы, якая б магла легітымна спыніць беззаконьне і дыктатуру.

Ня трэба баяцца, што пасьля аб'яўленьня імпічменту ўзурпатар выкарыстае сілу і «распусьціць» Вярхоўны Савет. Беззаконьнем, сілай Вярхоўны Савет не распускаецца. Імпічмент, прыняты парламантам, стане законным актам. Усе дзеяньні ўзурпатара пасьля імпічменту (калі яны ўзьнікнуць), у тым ліку правядзеньне рэферэндуму, ня будуць мець легітымнага характару. Рэжым авантурыстаў будзе пазбаўлены ўсялякіх персьпектываў, страціць усялякую падтрымку.

Падкрэсьліваю, рэферэндум Лукашэнкі накіраваны на легітымізацыю дыктатуры. Імпічмент жа пазбаўляе яго гэтай магчымасьці. Аб'явіць імпічмент можа толькі Вярхоўны Савет. Спадары дэпутаты, рэальнасьць такая, што лёс нацыі сёньня ў вашых руках і часу амаль не засталося. Зрабіце хутка патрэбны крок для Беларусі. Выканайце свой абавязак перад законам, краінай і будучыняй.

**Зянон Пазьняк,**
**Старшыня Беларускага Народнага Фронту «Адраджэньне «**
**11 верасьня 1996г.**

# ПАРАДАК ДНЯ: БЕЛАРУСЬ ПАСЬЛЯ ЛУКАШЭНКІ

### ЦІ ЗДОЛЕЕ АПАЗІЦЫЯ СТАЦЬ САПРАЎДНАЙ НАРОДНАЙ УЛАДАЙ?

**Восень, як прагназавалі ўсе палітычныя сіноптыкі, аказалася гарачай. Падзеі сезону яшчэ ня скончыліся, аднак некаторыя заканамернасьці ўжо сталі відавочнымі.**

Напрыклад, ініцыятыва А.Лукашэнкі па атрыманьні для сябе дыктатарскіх паўнамоцтваў блізкая да правалу. Пасьлядоўна задушыўшы ўсе наяўныя ачагі супраціву, ён меркаваў, што шлях наперад - чысты. Аднак, аказалася, што гэта толькі пачатак. Паглядзеўшы ў прорву грамадзкага расколу, ён, нават не ўсьвядоміўшы да канца яе глыбіню і небясьпеку, напалохаўся. Ці тое яшчэ будзе, А.Р.?

Другой значнай заканамернасьцю стала залежнасьць А.Лукашэнкі ад пазіцыі расейскага кіраўніцтва. Слабыя ўнутранымі супярэчнасьцямі, здрадамі, сталым узростам беларускія камуністы выклікалі на дапамогу «старэйшага брата» Г.Зюганава. Той запатрабаваў ад усіх, і, перш за ўсё, ад Прэзідэнта, «не нарывацца» на непрыемнасьці. А.Лебедзь , таксама пабываўшы ў Менску, адзінае, чым здолеў дапамагчы А.Р., дык гэта тым, што назваў яго сімпатычным хлопцам. На Б.Ельцына, каб ён нават і меў добрае здароўе, разьлічваць не выпадае. А.Лукашэнка сам са скуры вылазіў, завязваўся на залежнасьць ад Расеі. Расея аказалася іншай , чым ён уяўляў.

Нават У.Жырыноўскі прыняў пасільны ўдзел у палітычнай інтрызе на Беларусі, запусьціўшы ў нашу палітычную практыку такія характарыстыкі, як «педрило» і да т.п. Прывезены Зюганавым у Менск член ГКЧП В.Старадубцаў павінен быў сімвалізаваць згубнасьць курсу на нелегітымную зьмену ўлады.

Адным словам, расейскія палітыкі робяць на Беларусі ўсё, што хочуць, трэніруюцца ў самых агідных правакацыях (кшталту Ілюхінскай). Сапраўдны «беларускі палігон», прычым, бяскоштны: беларусы ўсё сьцерпяць.

Трэцяя заканамернасьць заключаецца ў тым, што апазіцыя хутка навучылася папулісцкім штучкам. Хочаце рэферэндум - наце вам, хочаце новую Канстытуцыю - калі ласка. Б'е апанента ягонай зброяй.

Прэзідэнт імкліва ляціць у нябыт.

І паўстае новае пытаньне: а што будзе пасьля адыходу А.Лукашэнкі?

Зноў будуць зыходзіцца «мах на мах» белыя з чырвонымі? Прыйшоў час прыняцьця доўгатэрміновых кампрамісаў. Вельмі зручным было б выкарыстаньне «круглага стала» дзеля абмеркаваньня будучыні Беларусі пасьля А.Лукашэнкі, дзеля ўсталяваньня адзіных правілаў палітычнай гульні.

Мудрасьць палітыка ў тым, каб апераджаць падзеі.

**Міхась КАПЯЛЮШ.**

# ЗГОДА І ГРАМАДА АБ'ЯДНАЛІСЯ

**24 верасьня ў Горадні адбыўся аб'яднаўчы сход мясцовых арганізацый БСДГ і ПНЗ. З абедзьвюх партый у аб'яднаную БСДП «Народная Грамада» папярэдне згадзіліся ўвайсьці 60 чалавек. На сходзе прысутнічалі 39.**

З Менску на сход прыехаў старшыня БСДГ Мікола Статкевіч. Планаваўся прыезд Георгія Таразэвіча. Але, па словах Статкевіча, Таразэвіч ня змог прысутнічаць на сходзе, бо павінен дапамагаць у арганізацыі паездкі сябра прэзыдыуму Вярхоўнага Савету Карпенкі ў Маскву.

Мікола Статкевіч выступіў перад прысутнымі і адказаў на некаторыя пытаньні:

**Пра абстаноўку ў партыях:** Партыі рыхтуюцца да канчатковага аб'яднаньня. Паводле гэтага пытаньня 5 кастрычніка павінна адбыцца паседжаньне сумеснага ЦК. Аб'яднаўчыя зьезды праходзяць па усей Беларусі. У БСДГ не было поўнага адзінства. На апошнім зьезьдзе чатыры дэлегаты прагаласавалі супраць зьліцьця дзьвюх партый. Была створана нейкая фракцыя па захаваньні Грамады. Але пасьля рэгістрацыі новай партыі старая спыніць свае існаваньне, і тыя некалькі чалавек, якія з гэтым ня згодны стануць беспартыйнымі.

**Наконт партыйнай сімволікі:** Сьцяг у нас адзін - наша праграма. Пакуль мы ня выпрацавалі агульнай сімволікі, вырашана, што да аб'яднаньня кожная партыя будзе карыстацца сваімі старымі сімваламі. **Пра палітычную сытуацыю ў краіне:** Лукашэнка апынуўся ў складаным становішчы. Яму зараз цяжка растлумачыць людзям, чаму рэферэндум трэба рабіць 7 лістапада, а не 24-га, чаму нельга ўвесьці на яго дадатковыя пытаньні. Пачаліся хістаньні. То прэзідэнт гатовы на кампрамісы, то ад яго адмаўляецца.З аднаго боку на яго цісьне Расея, якой патрэбна стабільнасьць у Беларусі, з другога – ўласныя памагатыя, якія загналі Лукашэнку ў такую сітуацыю і зараз пераконваюць, што ўсё правільна робіца.

**Стаўленьне Сацыял-Дэмакратычнага Саюзу да рэферэндуму:** Мы будзем заклікаць ісьці на рэферэндым і галасаваць супраць Канстытуцыі Лукашэнкі. Але толькі ў выпадку, калі рэферэндум адбудзецца 24 лістапада.

7 лістапада ніякага рэферэндуму ня будзе, гэта можа быць толькі нейкае апытаньне, якое праводзіць прэзідэнт. Яно ня мае юрыдычнай сілы.

Пасьля выступу Статкевіча , прысутныя на сходзе аднагалосна падтрымалі прапанову аб'яднаць партый. Быў абраны выканкам новай партыі,у склад якога ўвайшло па чатыры чалавекі ад БСДГ і ПНЗ. Старшынём абраны Міхась Патрэба ад БСДГ, намесьнікам Казімір Койта ад ПНЗ.

**Дз. КІСЕЛЬ.**

# ТОЛЬКІ РЭФЕРЭНДУМУ НАМ НЕ ХАПАЛА

**Размаўляючы з простымі людзьмі, за шчасьце і дабрабыт якіх так змагаецца тав.Лукашэнка, пераконваешся, што да ідэі правядзеньня рэферэндуму яны ставяцца, прынамсі, абыякава, ён ім не патрэбны. Але, калі добра папрацаваць са СМІ, правесьці ідэалагічную апрацоўку народных масаў, то значная частка насельніцтва падтрымае і ўхваліць як задумку правядзеньня рэферэндуму, гэтак і ўсе пытаньні, якія на яго выносяцца.**

У нас добра ўмеюць рабіць белае чорным. Узгадаць хаця б мінулы рэферэндум, які акрамя мільярдных выдаткаў ды сораму на ўвесь сьвет нічога не прынёс Беларусі ды яе народу.

Спытайце сёньня прахожых на вуліцы пра той рэферэндум, і яны ў большасьці сваёй не назавуць вам ня тое што дату яго правядзеньня, але й прапанаваных пытаньняў. А моладзь - тыя, каму жыць заўтра -увогуле праігнаравала яго. Упэўнены, так будзе і гэтым разам. Хіба хвалюе моладзь, якім будзе парламант, адна- ці двухпалатны? Ды хоць пяці! Маладых сёньня непакояць пытаньні немагчымасьці ўладкавацца на працу, бо заводы сапраўды «запушчаны».

Маладая сям'я з цяжкасьцю пракармлівае нават адно дзіця, а тыя 170 тысяч рублёў, што атрымлівае маці ў адпачынку па даглядзе за дзіцём, выглядаюць як насьмешка ўладаў. Я, як малады бацька, адчуваю гэта на сабе.

Зачыняюцца дзіцячыя садкі. Людзям па 2-3 месяцы не выплочваюць заробкаў, а кватрплату патрабуюць унесьці своечасова. Вось на што трэба зьвярнуць увагу тав.прэзідэнту, які так клапоціцца пра патрэбы простых людзей, а не «вытрасаць» астатнія грошы з кішэняў дарэшты зьбяднелага народу на розныя рэферэндумы.

Па папярэдніх падліках, на правядзеньне гэтага апытаньня спатрэбіцца блізу 30 (!) мільярдаў рублёў. Дык што, хіба ў нас грошы лішнія, ці праблемаў больш няма? Як спатрэбіліся б сёньня гэтыя 30 мільярдаў у школах, садках, бальніцах. Іх там так не стае!

6 верасьня на сустрэчы з дэпутатамі Вярхоўнага Савету прэзідэнт заявіў, што на правядзеньне рэферэндуму з бюджэту ня возьме ні капейкі. Вельмі сумніўна. Грошы будуць браць «дабравольна» з працоўных калектываў. Мы гэта ведаем, «дабравольна» у нас камуністы ў Фонд міру бралі.

Ну, дык што, грамада, скінемся яшчэ па 20-30 тысяч на правядзеньне прэзідэнцкага рэферэндуму? Прыхільнікам прэзідэнта прапаную ўтварыць фонд рэферэндумаў і скідвацца па 20-30 тысяч штомесяц. Хто ведае, колькі яшчэ іх будзе?

А ёсьць жа яшчэ адзін асьпект праблемы. Тав.Лукашэнка сам некалі казаў, што ў яго паўнамоцтвы проста царскія. І сапраўды, ён мае права дазваляць, забараняць, звальняць, прызначаць, караць, міласаць... дык што яшчэ трэба, якія паўнамоцтвы, якія рэферэндумы?

Людзі абралі, даверылі - працуй, дабівайся для людзей лепшай долі. Ну, а калі не атрымліваецца, трэба так і прызнаць, папрасіць прабачэньня ў народу і... Можа знойдзецца хто разумнейшы.

**Ігар ГЛЕБЕЦ,**
**сябра Беларускага Дэмакратычнага Саюзу Моладзі,**
**г.Маладэчна.**

# ...ТАК ЦІ ВАРТА Ў ІМ УДЗЕЛЬНІЧАЦЬ?

### (ДУМКА ВЕТЭРАНА)

**Значная частка грамадзян Беларусі, прыкладна 30 % не прымаюць удзелу ў выбарах і рэферэндумах. Іх называюць палітычна пасіўнымі. Аднак наўрад ці іх можна дакараць у адсутнасьці грамадзянскай пазіцыі. Няўдзел - гэта таксама пазіцыя, якая можа быць і сумленнай, і прынцыповай. На надыходзячым рэферэндуме паводле новай Канстытуцыі лічба непрымаючых у ім удзел хутчэй за ўсё павялічыцца. Нават юрысты-прафесіяналы спрачаюцца, гэта значыць ня могуць аб'ектыўна ацаніць праекты, якія вынесеныя на рэферэндум. Дзе ж тут разабрацца нам, грэшным. У гэтым выпадку, адчуваючы сваё неразуменьне, сумненьні, калебаньні, няўпэўненасьць, лепш ня ўдзельнічаць. Насьледуючы мудры медыцынскі прынцып: не нашкодзь.**

Палітыкі не разьлічваюць на сьвядомы выбар выбаршчыкаў. Яны разьлічваюць на давер, на тое, што людзі інтуітыўна ім паверацць. Гэта значыць, выбар выбаршчыкаў будзе вызначацца асабістымі сімпатыямі ці антыпатыямі да прэзідэнта Лукашэнкі. Нейкая частка з тых, хто галасаваў за яго ў 1994 годзе, пасьпела ў ім расчаравацца, але прыхільнікаў у яго ўсё яшчэ шмат. Большасьць? І так, і не.

Гэта, амаль напэўна, будзе большасьць з ліку тых, хто прыме ўдзел у галасаваньні, але ня будзе большасьць ад агульнага (паводле сьпісаў) складу выбаршчыкаў. Уявім, што ў галасаваньні на рэферэндуме прыме ўдзел 70% выбаршчыкаў, уявім таксама, што 70 % з іх прагаласуюць за прэзідэнцкі праект. І ён пройдзе, атрымаўшы падтрымку 49% выбаршчыкаў агульнай сьпісачнай колькасьці выбаршчыкаў. А што будзе, калі нязгодныя з прэзідэнцкім праектам, замест таго, каб удзельнічаць у рэферэндуме і галасаваць супраць супольна адмовяцца ад удзелу? Тады рэферэндум не адбудзецца, паколькі ў ім прыме ўдзел менш паловы выбаршчыкаў. Такім чынам, байкот рэферэндуму (гэта неад'емнае права кожнага грамадзяніна) можа аказацца найбольш верным і надзейным шляхам захаваньня дэмакратыі, чым палітычная актыўнасьць.

Такі выбар (пасіўная апазіцыя) мае яшчэ і тую перавагу, што дазваляе ня ўдзельнічаць у незаконным, неканстытуцыйным мерапрыемстве, якім зьяўляецца гэты рэферэндум, паколькі на яго выносяцца не асобныя папраўкі да Канстытуцыі, а яе цалкам новая рэдакцыя. Паводле закону, варта было б кожную прапанаваную зьмену і дапаўненьне да тэксту Канстытуцыі выдзяліць у асобныя самастойныя пытаньні на рэферэндуме, не гаворачы ўжо пра тое, што зусім недарэчы сюды прылепленыя працяг паўнамоцтваў прэзідэнта.

Могуць запярэчыць, што няяўка выбаршчыкаў на галасаваньне павялічвае магчымасьці фальсіфікацыі вынікаў (калі я не прагаласую сам, то за мяне прагаласуюць). Але гэта ўжо іншая тэма. Тэма грамадзкага і народнага кантролю, які павінен быць забясьпечаны.

**А.ФІРСАЎ.**

# МІЖПАРТЫЙНАЯ НАРАДА

16 верасьня ў Мастах адбылася рабочая нарада кіраўніцтва мясцовых арганізацый Беларускага Народнага Фронту «Адраджэньне», беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады і Таварыства беларускай мовы імя Францыска Скарыны. Разгледжаны стан беларускага школьніцтва ў горадзе, пытаньні ўзаемадзеяньня па падрыхтоўцы да рэферэндуму.

**Станіслаў СУДНІК.**

# ЭКСПРАПРЫЯЦЫЯ ЭКСПРАПРЫЯТАРАЎ?

Лукашэнка адкрыў сьпецыяльны рахунак «Рэферэндум-96», на які прапануе, а дакладней патрабуе, пераводзіць грашовыя сродкі прадпрыемстваў, сарамліва робячы агаворку, што гэта датычыць толькі тых, хто працуе з прыбыткам. Адным з такіх прыбытковых прадпрыемстваў зьяўляецца ДАІ. Гэтая ўстанова мае рахунак, куды паступаюць грошы ад замены нумароў, штрафы, плата за тэхагляд і інш. Днямі, па неафіцыйных зьвестках, гэты рахунак «арыштаваны» і ператвораны ў донарскі для «Рэферэндуму-96».

**Яраслаў ГРЫНЬКЕВІЧ.**

**P.S. Днямі наконт рахунку «Рэферэндум - 96» паступіла інфармацыя таксама з афіцыйных крыніц. Высьветлілася, што грошы на ўсенароднае апытаньне зьбіраюцца зусім на не сьпецыяльны, а на рахунак, які адкрыты яшчэ ў студзені дзеля паступленьня сродкаў даходнай часткі бюджэту.**

**Ай-яй-яй, Аляксандр Рыгоравіч, колькі ж можна, мякка кажучы, гаварыць няпраўду?**

**Што тычыцца рахунку ДАІ, дык пры такіх норавах, калі сьпецыяльны рахунак «пераблытаны» з бюджэтным, зусім верагодна, што бюджэтны можна лёгка «зблытаць» са сьпецыяльным.**

**Ва ўсякім разе прэзідэнт неаднойчы заяўляў, што грошай з бюджэту на свой рэферэндум ня возьме ні капейкі. Разумныя людзі ўжо даўно зразумелі, што прэзідэнцкія словы трэба разумець з дакладнасьцю наадварот.**

© PDF: Kamunikat.org 2013 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013



# ГІСТОРЫЯ І КУЛЬТУРА

## КАМУ СЬВЯТЫ́, КАМУ НАЦЫЯНАЛІСТ

**У чарговым фільме а-ля Азаронак, паказаным па БТ 10 верасьня, старшыня Вярхоўнага Савету Рэспублікі Беларусь Сямён Шарэцкі быў абвінавачаны ва ўсіх сьмяротных грахах і, таксама ў тым, што ён паставіў помнік Міндоўгу. Як заўжды, ведамства Замяталіна, якое зьяўляецца ідэйным натхняльнікам «новага беларускага кіно», крышку схлусіла. Сямён Шарэцкі сапраўды быў ініцыятарам пастаноўкі помніка, але не Міндоўгу, а Вялікаму князю Войшалку. І з 31 жніўня ў вёсцы Лаўрышава быў адкрыты помнік сьвятому Елісею Лаўрышаўскаму (манаскае імя князя Войшалка). 1 верасьня, у дзень беларускага пісьменства і друку, помнік асьвяціў Мітрапаліт Філарэт.**

Як жа адважыўся Філарэт асьвяціць помнік князю Вялікага княства Літоўскага, ведаючы нянавісьць А.Лукашэнкі да ўсяго нацыянальнага -беларускага? Справа ў тым, што князь Войшалк, сваімі дзеямі і жыцьцём стаіць у адным шэрагу з такімі тытанамі духу і руплівцамі хрысьціянства (праваслаўя, між іншым) як Ефрасіньня Полацкая, Кірыл Тураўскі, Клімент Смаляціч ды інш. Князь Войшалк заснаваў першы на тэрыторыі летапіснай Літвы кляштар, чым садзейнічаў непрыкметна мірнаму хрышчэньню цэлага народу. Ніводзін летапіс ня згадвае ніводнага канфлікту з рэлігійных матываў у гэтых мясьцінах. У кляштары была створана самая старажытная ліцьвінская кніга – «Лаўрышаўскае Евангельле». Гэта першая ілюстраваная беларуская кніга захоўваецца ў Кракаве ў народным музеі Чартарыйскіх. На кнізе захаваўся першапачатковы пераплёт - шэдэўр умельства залатароў 14 стагоддзя. Каштоўнае Евангельле з шматлікімі прыпіскамі на палях, якія даюць цудоўную інфармацыю пра мову, лад, тапаніміку Княства.

Да нас дайшло і некалькі іншых кніг, створаных у Лаўрышаўскім кляштары.

Лаўрышаўскі кляштар праіснаваў шмат стагоддзяў. У час Першай сусьветнай вайны тут праходзіла лінія расейска-германскага фронту. Кляштар быў разбураны. Пасьля вайны была адноўлена толькі вёска Лаўрышава.

Варта зазначыць, што змаганьне Лука-Замяталіных з беларускімі нацыянальнымі сьвятынямі ўсё болей нагадвае змаганьне з ветракамі. Нацыянальная памяць беларусаў прачынаецца, і гэтага абуджэньня не спыніць нікому.

**Станіслаў СУДНІК.**

## ЯК ЖЫВЕЦЦА ПАЦУКУ ПАД ЧАС ГОДУ ПАЦУЧАГА...

**Як вядома, 1996-ы год паводле ўсходняга календару зьяўляецца годам Пацука. Каб факт гэты не заставаўся па-за ўвагай, і адбылася гутарка з вядомым артыстам, салістам ансамбля «Вясельле» Міхасём Пацуком.**

***- Ансамбль «Вясельле» нядаўна вярнуўся з Гішпаніі. Якія ўражаньні?***

- Уражаньняў шмат. Мы далі 30 канцэртаў па ўсёй Андалузіі. І ўсё гэта за даволі кароткі тэрмін (з 30 чэрвеня па 6 жніўня). Жылі ў г.Кармоні, што знаходзіцца ў 35 км ад Севілы. Гішпанская прэса не абыйшла ўвагай гастролі «Вясельля» (Міхась паказвае вялізныя артыкулы гішпанскіх газет). Калі нам трэба было ехаць дадому, нас прасілі застацца. У некаторых гарадах мы зьбіралі шматтысячныя плошчы слухачоў. Такога мы не чакалі.

***- Міхась, якія ў ансамбля творчыя планы на будучыню?***

- У кастрычніку плануюцца выступленьні ў Канадзе. Гастролі ў ПАР (ЮАР) хутчэй за ўсё не адбудуцца.

***- «Вясельле» з цікавасьцю прымаюць за мяжой і ў нас на Беларусі. А ці праўда, што ў роднай краіне па некалькі месяцаў не выплочваюць зарплату?***

- Казаць страшна, але гэта так. Часам па 4-5 месяцаў ня плоцяць грошай.

***- Ты сьпяваеш народным тэнарам. Такі голас сустракаецца на эстрадзе нячаста...***

- Ведаеш, на эстрадзе раней у зеніце папулярнасьці былі барытоны (Кабзон, Вуячыч, Магамаеў). Зараз шмат хто мае фальцэт. Народныя тэнары сустракаюцца зрэдку.

***- З кім з беларускіх «зорак» сябруеш?***

- Я таварыскі чалавек і сяброў у мяне шмат. Знаходжуся ў добрых адносінах з Ядзей Паплаўскай і Аляксандрам Ціхановічам. Другога Аляксандра - Саладуху - ведаю з 1988 году, калі ён быў толькі Сашам і тады яшчэ толькі расказваў мне пра свае грандыёзныя планы. Сябры таксама бываюць розныя. Калі-некалі даводзіцца зьвяртацца за парадай сяброўскай да Ярмоленкі.

***- Ці траплялі ў «Вясельлі» з-за трохі сьмешнага прозьвішча саліста ў недарэчныя сітуацыі?***

- Аднойчы мы выступалі з канцэртамі на Берасьцейшчыне ў сельскім клубе. Недзе ўверсе па бэльцы прабег пацук. Усе зааралі: «Пацук зьбег, пацук зьбег!» Канцэрт вось-вось павінен быў пачацца, а калегі па працы падумалі, што зьбег я.

***- Як жывецца Пацуку пад час году пацучага?***

- Складана жывецца, бо жыцьцё зараз такое.

## АСАРЦІ БЕЛАРУСКАЙ ЛАЦІНКАЙ

**Прачытаўшы дасланы ў «ПАГОНЮ» зборнік вершаў Юрая Касіча «Каралева зіма» (Juraj Kasic. Karaleva zima. Віцебск, 1996), я яшчэ раз упэўніўся, на колькі сёньня актуальны заезджаны афарызм Някрасава «Поэтом можешь ты не быть...». Бо сапраўды, мала аднаго жаданьня пісаць вершы і мець «правільную» грамадзянскую пазіцыю, мала гаркнуць «на всё воронье горло», ды падумаць, што гэта «трели соловья». Што штурхнула аўтара да выданьня чацьвёртага (!) зборніка і пайсьці на абардаж сучаснай бел.літ.? Няўжо ён не «абламаўся» на трох папярэдніх кніжачках, якія не займелі свайго чытача і не зацікавілі крытыкаў?**

Больш таго, «Каралева зіма» - выдадзеная аўтарам на беларускай лацінцы - гэта нейкі гібрыд вершаў, адвольных перакладаў з Вярцінскага, Бродзкага і Акуджавы, малюнкаў, густа перасыпаных граматычнымі, арфаграфічнымі ды стылістычнымі памылкамі. Няўжо цяжка было знайсьці рэдактара? Вельмі прыкра, але ані беларуская лацінка, ані аўтарытэт Таварыства Вольных Літаратараў ня сталі для аўтара надзейным фігавым лістком і не ўратавалі ад поўнага правалу. Шкада, але з-за апантанай безадказнасьці пацярпела ідэя незалежнага кнігавыданьня.

Пацярпеў яшчэ раз і паэт Славамір Адамовіч, стаўшы героем верша «Hlupaja piesnia». Чаго варты радкі: «Адамовіча расстралялі. Вось і ахвяра між нас./ А мы ўжо сьмяемся, рагочам - маўляў, не прыйшоў яшчэ час.» ці «Адамовіч ня быў самотным. І жанчынаў «баб'ём» называў./ А яны яго жарка любілі. Ён жа іх як пальчаткі ўжываў» і г.д.

Дзякуй Богу, Славамір Адамовіч жывы. А вось парасткі паэзіі ў зборніку Юрая Касіча ператварыліся ў «глупую песьню».

**Юры ГУМЯНЮК.**

## ВЫРАТАВАНЫЯ КАШТОЎНАСЬЦІ

**У Гарадзенскім гісторыка-археалагічным музеі ёсьць экспазіцыя пад назвай «Скарбы, вернутыя народу». Тут знаходзяцца самыя цікавыя прадметы, канфіскаваныя апошнім часам супрацоўнікамі УКДБ і мытні ў кантрабандыстаў на мяжы.**

Прыемна, што нарэшце перамагла справядлівасьць, і вырванае з лап кантрабандыстаў на нашай мяжы цяпер не сплывае бясьследна ў Маскву, а застаецца ў нас.

Прадметы, якія паступілі ў музей, перш, чым заняць адпаведнае ім месца ў фоньдзе, павінны прайсьці навуковую апрацоўку па ўсіх правілах музейнай справы. Сярод новых экспанатаў - чатыры рускія іконы другой паловы XIX стагоддзя, некалькі выдадзеных да рэвалюцыі ў Маскве і Санк-Пецярбурзе рэдкіх кніг, у тым ліку іўдзейскі малітоўнік на нямецкай мове, альбомы з рэдкімі калекцыямі, заходнеэўрапейскі і расейскі фарфор, у прыватнасьці, вырабы вядомага «Таварыства Кузьняцова», карціны, акварэлі, малюнкі вядомых мастакоў І.Мяшкова, Н.Піманенкі, К.Гарбатава, якія тварылі на мяжы XIX-XX стагоддзяў.

Аўтарства некалькіх мастацкіх работ пакуль што канчаткова не ўстаноўлена. Але эксперты мяркуюць, што, напрыклад, эскіз «Масьленіца» належыць пэндзлю Барыса Кустодзіева, а аўтарам цудоўнага нацюрморта і карціны «Багародзіца з дзіцём» зьяўляецца першая руская авангардыстка Наташа Ганчарова.

З іншых рэчаў найбольшую каштоўнасьць уяўляе 2-кілаграмовае сувенірнае блюда з срэбра з умантаванымі дзевяцю медалямі і кляймом Фабержэ.

**Ю.ШАСТАК,**
**ст.навуковы супрацоўнік ГДГАМА.**

## НА ЗЯМЛІ ПРОДКАЎ



Многія дзесяцігоддзі ў нашай краіне існавала жалезная заслона. Нельга было амерыканцу патрапіць ў Беларусь, а беларусу - у Амерыку. Існавалі нават абмежаваньні ў абмене лістамі. Тыя, хто атрымліваў лісты з Амерыкі, прасьледаваліся. Цяпер заслоны ня стала, калі ёсьць у кішэні грошы, дык едзь ня толькі ў Амерыку, але ў іншыя краіны сьвету. Едуць і да нас. У жніўні горад Скідаль наведалі дзьве амерыканкі: Лінда Хагл з дачкой Брэндзі. Яны прыехалі на зямлю сваіх продкаў, тут жыў іх дзед і прадзед Ф.Сарнацкі. Госьці знаёміліся з горадам, цікавіліся збудаваньнямі мінулага. Адбылася сардэчная сустрэча з жыхарамі вул.Зелянкоўскага.

**Ільля БАРЫСАЎ.**

**НА ЗДЫМКУ: Лінда Хагл (у сярэдзіне) у момант гутаркі.**
**Фота аўтара.**

## МЭТАЛЁВАЕ ШОЎ
### У СТАРЫМ ПАРКУ

**20 верасьня ў Гарадзенскім клубе «Repley», які знаходзіцца ў Старым парку, адбыўся канцэрт менскіх гуртоў Exhumator, Degrade і Splenetic.**

Перад канцэртам прадаваўся першы беларускі часопіс экстрэмальнай музыкі «Легіён», відэакасеты з запісам канцэртаў менскага гурта Exhumator і аўдыёкасеты з іхнім апошнім альбомам. Праграму канцэрту распачала каманда Splenetic. Напрыканцы быў выступ Exhumator'a.

Гэты канцэрт адкрыў праграмнае металёвае турнэ гурта Exhumator з іншымі камандамі Беларусі і краін блізкага замежжа: Расеі (Масква, Санкт-Пецярбург), Малдовы (Кішынёў) і Украіны (Кіеў). Уся праграма праходзіць пры садзейнічаньні радыёпраграмы «Небясьпечная зона». Заключны канцэрт адбудзецца ў Менску 27 верасьня.

У гарадзенскім канцэрце не прымаў удзелу абяцаны гурт «Тарнада». Хлопцы не змаглі прыехаць, бо заняты запісам новага альбому.

**Андрэй НОВІК.**

## КРЫЖАВАНКА

**Склаў Сяргей ГРЫНЬ.**



**Па гарызанталі:** **3**.Частка сьвету. **5**.Звод законаў у некаторых краінах Эўропы XVI-XVIII ст.ст. **9**.Электрамагнітны генератар пераменнага току для ўтварэньня іскры. **11**.Чалавек, ахоплены якой-небудзь хваравітай ідэяй, вар'ят. **12**.Гара ў Арменіі, добра вядомая ўсім заўзятарам футболу. **13**.Народны і бальны танец з шасьці фігур, распаўсюджаны ў многіх эўрапейскіх народаў, а таксама музыка гэтага танца. **18**.Шматгадовая расьліна с цьвёрдым ствалом і адыходзячымі ад яго галінамі. **19**.Група людзей, якія імкнуцца любымі сродкамі дасягнуць якіх-небудзь карысьлівых мэтаў. **21**.Мысьленны вобраз, уяўленьне. **22**.Урачысты бальны танец, які выконваецца парамі. **23**.Двор памешчыка разам з зямельнымі ўгоддзямі. **27**.Воклiч, які азначае захапленьне, пахвалу, адабрэньне. **28**.Магазін, лаўка. **29**. Луста хлеба. **31**.Сукупнасьць практычных мерапрыемстваў, якія садзейнічаюць захаваньню здароўя. **35**.Сорт вінаграду, дысертнае віно з гэтага вінаграду. **36**.Інструмент для атрыманьня шчылін у метале, грунце, дрэве. **37**.Выключная адоранасьць. **38**.Хімічны элемент, шчолачны метал серабрыста-белага колеру. **39**.Адна з найменшых па плошчы краін Эўропы.

**Па вертыкалі:** **1**.Бядровая частка сьвіной тушы, шынка. **2**.Мясцовасьць з прыроднымі лекавымі сродкамі, прыгодная для пабудовы санаторыяў. **4**.Сталіца цэнтральнаэўрапейскай краіны. **6**.Ганаровае радавое або дараванае дваранскае званьне. **7**.Адсутнасьць кіраўніцтва, безуладдзе. **8**.Бой тарэадора з быком. **10**.Найвялікшая гістарычная каштоўнасьць Горадні. **14**.Кіраўніцтва факультэту вышэйшай навучальнай установы. **15**.Кандытарскі выраб, які атрымліваецца шляхам перапрацоўкі зерня какавы з цукрам. **16**.Чалавек, які валодае сістэмай фізічных практыкаваньняў, якія садзейнічаюць агульнаму разьвіцьцю арганізму. **17**.Ядавітае наркатычнае рэчыва, якое маецца ў тытуні. **19**.Пісар, канторскі служачы. **20**.Імклівы напад войск на пазіцыі праціўніка. **24**.Каўпак на лямпе для адлюстраваньня сьвятла і для засьцярогі вачэй ад яго яркасьці. **25**.Адбітак з негатыву, на якім сьветлыя і цёмныя часткі адпавядаюць іх сапраўднаму размеркаваньню ў рэчаіснасьці. **26**.Ударны музычны інструмант у выглядзе металічнага дыска, разнавіднасьць гонга. **30**.Пратэстанцкі сьвятар. **32**.Возера на поўдні Фінляндыі. **33**.Адна з буйнейшых рэк Беларусі. **34**.Кожная з чатырох фаз Месяца.

**АДКАЗЫ НА КРЫЖАВАНКУ, ЗЬМЕШЧАНУЮ Ў ПАПЯРЭДНІМ НУМАРЫ:**

Па гарызанталі: 1.Ратуша. 4.Гарнір. 8.Хабар. 9.Краты. 14.Цырк. 15.Лангуст. 16.Гран. 19.Нафта. 20.Выдра. 22.Акула. 23.Метро. 24.Піхта. 30.Імбір. 31.Абора. 32.Лаўра. 33.Вяж. 34.Вазелін. 37.Егер. 40.Катэр. 41.Набат. 42.Аналіз. 43.Біблія.

Па вертыкалі: 2.Трак. 3.Шкала. 5.Абрыс. 6.Нота. 7.Дацэнт. 10.Фантан. 11.Шрыфт. 12.Агіда. 13.Браун. 17.Салетра. 18.Дактыль. 20.Вярба. 21.Аліва. 25.Ліхвяр. 26.Абсяг. 27.Колер. 28.Пурга. 29.Сакрэт. 35.Арэлі. 36.Івасі. 38.Зала. 39.Баул.

## НАШ КАЛЯНДАР

**29 верасьня**

**1794 г.** Нарадзіўся Ігнат Ходзька, пісьменьнік, мемуарыст. Большую частку жыцьця правёў у маёнтку Дзевятня на Смаргоншчыне.



**1823 г.** нарадзіўся Уладзіслаў Сыракомля (Людвік Кандратовіч), знакаміты паэт-гуманіст, публіцыст. Вучыўся і значны час працаваў на Наваградчыне.

**1891 г.** Нарадзіўся Аркадзь Смоліч (105 гадоў таму ), выбітны грамадзкі і культурны дзеяч, віцэ-прэм'ер Рады БНР. У 1920/21 гг. жыў у Горадні. Рэпрэсаваны ў 1938-ым.



**30 верасьня**



**1728 г.** У вёсцы Слямянцы Гарадзенскага павету нарадзіўся Марцін Пачобут-Адляніцкі, славуты астраномам, стваральнік і кіраўнік Віленскай абсерваторыі.

**1794 г.** Для мабілізацыі гараджанаў і шляхты ў Горадню прыбыў Тадэвуш Касьцюшка.

**1892 г.** Нарадзілася Зоська Верас (Людвіка Сівіцкая), легендарная пісьменьніца і публіцыстка, з якой зьвязана цэлая эпоха беларускага Адраджэньня.

**1 кастрычніка**

Міжнародны дзень музыкі.

**2 кастрычніка**

**1413 г.** Была падпісана Гарадзельская вунія - саюз Вялікага княства Літоўскага з Польскім каралеўствам.

**4 кастрычніка**

**1582 г.** На землях Рэчы Паспалітай быў уведзены грыгарыянскі каляндар (так званы «новы стыль»).

**1742 г.** Нарадзіўся Франьцішак Карпінскі (255 гадоў таму), вядомы асьветнік, пісьменьнік, публіцыст. Працяглы час жыў у маёнтку Хораўшчына (Сьвіслацкі раён).

**Падрыхтаваў Ул.ХІЛЬМАНОВІЧ.**

© PDF: Kamunikat.org 2013 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

